## <u>Пералік экскурсій</u>

## <u>ДЛЯ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ:</u>

Увага! Заняткі * могуць праводзіцца як у музеі, так і на выездзе ў навучальнай установе. Па жаданні заказчыка можна праводзіць разавыя заняткі, а таксама скласці цыкл з тэм, якія цікавяць.

1. Як да нас прыйшла кніга.*
2. Беларускі народны посуд.*
3. Прыгоды гадзіннікавай стрэлачкі.*
4. Звяры і птушкі ў беларускіх казках.*
5. Птушкі нашага горада.*
6. Домік у моры.*
7. Папяровыя карункі.*
8. Музейная Батлейка.*

**Заняткі ў музеі па тэме «Прыродазнаўства»**

1. Па лясных сцяжынках. Стары замак.
2. Наш блакітны край. Стары замак.
3. У госці да Нептуна. Стары замак.
4. Зімовая паляна. Стары замак.
5. Вясновыя гісторыі. Стары замак.
6. Летнія клопаты. Стары замак.
7. Восень у лесе і полі. Стары замак.
8. Па слядах Ст. Жыўны – заснавальніка музея прыроды ў Гродне.
9. Лунаючыя кветкі. Новы замак.
10. Домік у моры. Новы замак.

**Заняткі ў музеі па тэме «Гісторыя краю»**

1. Добры дзень, музей! Стары замак.
2. Жыццё старажытных людзей у нашым краі. Стары замак.
3. Цацкі і гульні маленькіх гарадзенцаў у старажытнасці. Стары замак.

4. Казка старога горада. Стары замак.
5. З куфэрка беларускай прыгажуні. Стары замак.
6. Гродзенцы ў барацьбе з крыжакамі. Стары замак.
7. Гродзеншчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Стары замак.
8. Легенды і паданні Беларусі. Новы замак.
9. Сведкі вячыстай славы. Новы замак.
10. Старажытныя вераванні беларусаў. Музей Гарадніцы.
11. Максімаў домік у Гародні. Музей М.Багдановіча.

**Заняткі ў музеі па тэме «Мастацтва». (Новы замак)**

1. Віды мастацтва.
2. Як глядзець і разумець карціну.
3. Парцалянавы спадачак.

***Цыкл заняткаў «КАЛЯДНЫЯ СУСТРЭЧЫ Ў МУЗЕІ»***

*(для вучняў 1-4 класаў, іх бацькоў і настаўнікаў)*

Методыка падачы матэрыялу разлічана на дзяцей, але заняткі будуць цікавыя і дарослым. Практычныя заданні, імправізаваныя выставы, тэатралізацыя і гульні разлічаны на сумесную дзейнасць дзяцей і іх бацькоў. Такія заняткі садзейнічаюць раскрыццю асобы дзіцяці і з'яднанню сям'і. Цыкл складаецца з музейна-педагагічных заняткаў:

1. «Што такое Новы год?». Уводны занятак. Новы замак.

2. «Зімовыя ўзоры: выцінанка». Музей гісторыі Гарадніцы.
3. «Каляды ў музеі». Стары замак.
4. «Раство Хрыстова». Паказ музейнай батлейкі. Новы замак.
5. «Казкі для Дзеда Мароза». Заключная частка – ранішнік з Снягуркай і Дзедам Марозам.

## ДЛЯ СЯРЭДНІХ І СТАРШЫХ КЛАСАЎ:

**Тэматычныя экскурсіі ў музеі па тэме «Гісторыя краю»**

1. Старажытныя помнікі Панямоння. Стары замак.
2. Гродзенская школа дойлідства (XII ст.) Ніжняя царква.
3. Зброя мінулых стагоддзяў. Новы замак.
4. Сярэднявечныя замкі Панямоння. Стары замак.
5. Гродзеншчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Стары замак.
6. Па слядах Ст. Жыўны – заснавальніка Музея прыроды ў Гродне.

**Тэматычныя экскурсіі ў музеі па тэме «Прыродазнаўства»**

1. Дзівосны свет прыроды. Новы замак.
2. Заалагічная геаграфія. Новы замак.
3. Па старонках Чырвонай кнігі Беларусі. Стары замак.

Увага! Па жаданні заказчыка можна праводзіць як разавыя экскурсіі, так і скласці цыкл з тэм, якія цікавяць Вас, паважаныя настаўнікі.

## *ЛЕКЦЫІ*

I. **Гісторыя краю**

1. Сярэднявечныя замкі Панямоння.
2. Архітэктура Гродна ў XII - XIX стст.
3. Іх імёнамі названы вуліцы горада Гродна.
4. Старонкі гісторыі Гродна.
5. Гродзенчшына літаратурная.

II. **Гістарычныя постаці**

1. Вітаўт Вялікі і яго эпоха.
2. Стэфан Баторый – кароль Рэчы Паспалітай.
3. Дзейнасць Антонія Тызенгаўза ў Гродна.
4. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі – апошні кароль Рэчы Паспалітай.
5. Паэтэса Ларыса Геніюш.

III. **Мастацтва**

1. Тайны тканых і вышываных узораў.
2. З гісторыі кнігадрукавання на Беларусі.
3. Святы і абрады беларусаў.
4. Беларуская народная цацка.
5. Беларускі шляхецкі касцюм.

***МУЗЕЙНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАГРАМА "ГРОДНАЗНАЎСТВА"***

***«ГАРАДЗЕНСКІЯ ВАНДРОЎКІ»***

***(Цыкл пешаходных экскурсій па вуліцах і плошчах Гродна)***

Мэта праграмы – знаёмства з унікальнымі помнікамі архітэктуры і стварэнне цэласнага ўяўлення аб гісторыі і культуры г. Гродна праз вандроўкі па яго вуліцах і плошчах. Праграма разлічана на розныя ўзроставыя катэгорыі наведвальнікаў. Замаўляцца можа як увесь цыкл вандровак, так і асобныя вандроўкі па жаданні наведвальніка.

1. Шпацыруем па вуліцы Замкавай.
2. Плошча Савецкая. Гісторыя забудовы і падзеі.
3. Вандроўка па Гарадніцы.
4. Што такое помнік.
5. Шпацыруем па вуліцы Савецкай.

## ***МУЗЕЙНАЯ БАТЛЕЙКА***

У аснову лялечнага прадстаўлення пакладзены рэлігійныя сюжэты, якія звязаны з нараджэннем і ўваскрэсеннем Іісуса Хрыста (“Раство Іісуса”, “Цар Ірад”, “Велікодны цуд”), а таксама спектаклі на гістарычную тэму “Пажар у замку Вітаўта”, “Легенда Святога Губерта”. Самому лялечнаму прадстаўленню папярэднічае кароткі экскурс у гісторыю ўзнікнення батлейкі з паказам мультымедыйнай прэзентацыі. Прадугледжана і практычная частка, падчас якой дзеці актыўна занятыя творчасцю. <u>Спектаклі праводзяцца як у музеі, так і на базе ўстаноў адукацыі (пры ўмове арганізаванага наведвання класамі па паралелях).</u>

## ***КОНКУРСЫ ДЛЯ ЮНАЦКА-МОЛАДЗЕВАЙ АЎДЫТОРЫІ***

У мэтах развіцця ў юнацтва і моладзі патрыятычных, грамадзянскіх пачуццяў, павагі да гістарычнай спадчыны, дзеля больш шырокага далучэння музея да выхаваўчага працэсу ў навучальных установах горада і вобласці, уплыву на фарміраванне трывалых суадносін музея і юнацка-моладзевай аўдыторыі музейарганізуе і праводзіць конкурсы:

**«МУЗЕЙ У ФАРБАХ»** – конкурс дзіцячай творчасці сярод навучэнцаў мастацкіх школ, школ і класаў з мастацкім ухілам, цэнтраў пазашкольнай выхаваўчай працы г. Гродна. Ставіць мэтай

дапамагчы юным гродзенцам раскрыць асабісты творчы патэнцыял, паказаць магчымыя накірункі развіцця індывідуальных здольнасцяў, садзейнічаць выпрацоўцы свабоды выказвання свайго бачання той ці іншай з'явы. Праводзіцца раз у два гады.

**«МУЗЕЙ ПРАЗ ФОТААБ'ЕКТЫЎ»** – абласны фотаконкурс для навучэнцаў установаў сярэдняй, сярэдне-спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай, вышэйшай адукацыі і працоўнай моладзі г. Гродна і Гродзенскай вобласці. Ставіць мэтай прыцягнуць увагу і выклікаць творчае стаўленне маладога пакалення да сучаснага музея. А таксама дапамагчы маладым фотааматарам раскрыць асабісты творчы патэнцыял, развіць індывідуальныя здольнасці і эстэтычны густ. Праводзіцца раз у два гады.

## *КВЭСТ-ГУЛЬНЯ "У ПОШУКАХ СКАРБУ" ПА СТАРОМУ ЗАМКУ*

Квэст – музейная камандная гульня з паслядоўным мінаннем этапаў, якія складаюцца з некалькіх заданняў і суправаджаюцца падказкамі. Выкананне кожнага папярэдняга задання дае магчымасць перайсці на наступны этап гульні. Кожная каманда мае права мець кансультанта (выкладчык, супрацоўнік навукова-асветніцкага аддзела). Галоўная задача каманд - знайсці «частку скарба» Стэфана Баторыя, схаванага прывідам ў Старым замку. Адшукаць яе і даведацца, што схаваў таямнічы прывід, магчыма толькі пакрокава выконваючы рознаўзроўневыя заданні (анахранізмы, праца з карта-планамі, раскоп і г.д.).